Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
_____________Ю. П. Бондар
«___» _______________ 2016 г.
Рэгістрацыйны № ВД- _____/вуч.

# ГІСТОРЫЯ МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2016

**СКЛАДАЛЬНІК**

*І. І. Бамбешка*, старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*А. А. Гужалоўскі*, прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар;
*А. Я. Корсакава*, дацэнт кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 27.05.2015);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 29.10.2015)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: І. І. Бамбешка

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Важнай передумовай паспяховай навуковай і практычнай работы музеязнаўцаў з'яўляецца рацыянальнае разуменне развіцця музея, якое правамерна прызнаць абавязковым кампанентам сучаснай музейнай практыкі з яе праектаваннем у будучыню, паколькі як мінулае, так і сучаснае – неад'емныя складовыя часткі адзінага гістарычнага працэсу. Разгляд гістарычнага вопыту музейнай справы неабходны для тэарэтычнай і практычнай распрацоўкі актуальных пытанняў музеязнаўства.

Натуральна, што зразумець сацыякультурнае значэнне музея ў жыцці чалавецтва магчыма толькі пры ўмове яго вывучэння ў гістарычнай перспектыве і абавязкова ў асобных рэгіёнах свету. У рэшце рэшт, гісторыя музейнай справы з'яўляецца складовай часткай музеязнаўства побач з тэарэтычным і прыкладным музеязнаўствам, а таксама музейным крыніцазнаўствам. Без вывучэння гісторыі музейнай справы цяжка ўявіць сабе далейшае паспяховае развіццё гэтай галіны навукі.

Гэтыя абставіны робяць дадзеную вучэбную дысцыпліну надзвычай актуальнай у працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Праграма вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя музейнай справы» прызначана для студэнтаў спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны».

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя музейнай справы» непасрэдна звязана з шэрагам музеязнаўчых («Тэорыя і методыка музейнай справы», «Музейная педагогіка», «Музеі замежных краін» і інш.) і агульнагістарычных дысцыплін («Сусветная гісторыя» і «Гісторыя Беларусі»), а таксама з такімі дысцыплінамі, як «Філасофія», «Тэорыя і гісторыя культуры», «Гісторыя мастацтва» і інш.

*Мэтай* выкладання дадзенай вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца вывучэнне студэнтамі пытанняў узнікнення і развіцця музейнай ідэі і яе ўвасаблення ў перадмузейных зборах і музеях, музейнай сеткі, арганізацыі музейнай справы, музейнага заканадаўства, музеязнаўства як навукі, музейнай практыкі на розных гістарычных этапах.

Мэтавая накіраванасць вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя музейнай справы» прадугледжвае вырашэнне шэрагу *задач*:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– разгляд асаблівасцей вывучэння крыніц і гістарыяграфіі гісторыі музейнай справы на розных гістарычных этапах;

– выяўленне сацыяльных і культурных перадумоў для стварэння збораў музейных прадметаў;

– асвятленне сацыяльных і культурных умоў стварэння калекцый музейных прадметаў і саміх музеяў;

– раскрыццё зместу асноўных этапаў станаўлення і развіцця калекцый музейных прадметаў і саміх музеяў у розных краінах у сувязі з сацыяльным і культурным развіццём чалавецтва;

– тлумачэнне асноўных заканамернасцей і пераемнасці развіцця музейнай справы ў розных рэгіёнах свету;

– вывучэнне фарміравання кола праблем, якія атрымалі адлюстраванне ў калекцыях і музеях;

– высвятленне таго, інтарэсы якіх сацыяльных груп адлюстроўвалі гэтыя калекцыі і музеі;

– даследаванне дзейнасці музеязнаўчых устаноў і арганізацый, падрыхтоўкі музейных кадраў, выдавецкай дзейнасці па музейнай праблематыцы.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя музейнай справы» студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя этапы развіцця музейнай справы буйнейшых краін свету;

– гісторыю развіцця музейнай справы ў Беларусі;

– асноўныя паняцці тэорыі і методыкі гісторыі музейнай справы;

– ролю музеяў у развіцці культуры чалавецтва;

*умець:*

– выкарыстоўваць асноўныя паняцці, законы і фактычны матэрыял па гісторыі музейнай справы ў тэарэтычнай, метадычнай і практычнай музейнай дзейнасці;

– аналізаваць крыніцы па гісторыі музейнай справы Беларусі;

– даць характарыстыку гісторыі музейных устаноў, фарміравання музейнага фонду буйнейшых краін свету;

– аналізаваць вопыт музейнага будаўніцтва ў асобных рэгіёнах і краінах;

– вызначаць месца і ролю музеяў Беларусі ў развіцці сусветнай культуры.

Студэнты *павінны валодаць:*

– асноўнымі метадамі гісторыка-музейных даследаванняў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– гістарыяграфіяй, крыніцазнаўствам і метадычнымі прыёмамі вывучэння гісторыі музейнай справы.

Акрамя таго, студэнты павінны навучыцца аналізаваць гістарычныя ўмовы развіцця музеяў і музейнай справы, ацэньваць дзеянні і выказванні калекцыянераў і музейных дзеячаў як з улікам сённяшняга стану музейнай думкі, так і з пункту гледжання ідэй, адпаведных падзеям эпохі, аналізаваць інфармацыйныя крыніцы і аргументаваць уласны пункт гледжання.

Дадзеная вучэбная праграма арыентавана перш за ўсё на вывучэнне агульных пытанняў гісторыі музейнай справы. Асаблівая ўвага пры гэтым надаецца беларускаму матэрыялу. Імкненне да абагульненасці акрэсліла агульную структуру праграмы. Увесь матэрыял згрупаваны па тэмах, якія храналагічна супадаюць з традыцыйным падзелам гістарычнага працэсу.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя музейнай справы» прадугледжана 180 гадзін, з іх 76 – аўдыторных (46 гадзін – лекцыйныя, 30 гадзін – семінарскія).

Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | сем. заняткі |
| Уводзіны | 1 | 1 | |
| **Раздзел I. Агульныя тэарэтыка-метадычныя пытанні гісторыі музейнай справы** | | | |
| *Тэма 1.* Тэарэтычныя аспекты гісторыі музейнай справы | 1 | 1 | |
| *Тэма 2.* Крыніцазнаўства гісторыі музейнай справы | 1 | 1 | |
| *Тэма 3.* Гістарыяграфія гісторыі музейнай справы | 5 | 3 | 2 |
| **Раздзел II. Гісторыя музейнай справы** | | | |
| *Тэма 4.* Дамузейнае збіральніцтва ў Старажытным свеце і Сярэдневякоўі | 4 | 4 | |
| *Тэма 5.* Узнікненне музея як сацыякультурнага інстытута. Музейная справа ў эпоху Адраджэння | 10 | 6 | 4 |
| *Тэма 6.* Фарміраванне музея як сацыяльнага інстытута ў эпоху Асветы | 10 | 6 | 4 |
| *Тэма 7.* Пераўтварэнне музеяў у публічныя ўстановы. Музейная справа ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. | 8 | 4 | 4 |
| *Тэма 8.* Спецыялізацыя музеяў. Музейная справа ў другой палове XIX – пачатку XX ст. | 12 | 8 | 4 |
| *Тэма 9.* Асноўныя тэндэнцыі развіцця музейнай справы ў краінах Заходняй Еўропы і Амерыкі паміж дзвюма сусветнымі войнамі | 6 | 6 | |
| *Тэма 10.* Музейная справа ў СССР у 1917–1941 гг. | 4 | | 4 |
| *Тэма 11.* Музейная справа ў краінах свету ў другой палове XX – пачатку XXI ст. | 4 | | 4 |
| *Тэма 12.* Музейная справа ў СССР і на постсавецкай прасторы ў другой палове XX – пачатку XXI ст. | 10 | 6 | 4 |
| **Разам…** | **76** | **46** | **30** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Месца курса ў сістэме гуманітарнай адукацыі як базавай дысцыпліны па спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». Месца курса ў сістэме музеялагічных дысцыплін. Сувязь курса «Гісторыя музейнай справы» з курсамі айчыннай і сусветнай гісторыі і культуры.

Мэта і задачы курса. Прадмет курса. Структура курса. Формы кантролю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел I. Агульныя тэарэтыка-метадычныя пытанні гісторыі музейнай справы

### *Тэма 1. Тэарэтычныя аспекты гісторыі музейнай справы*

Гісторыя музейнай справы як структурная адзінка музеязнаўства. Аб'ект і прадмет гісторыі музейнай справы. Праблематыка і метады вывучэння гісторыі музейнай справы.

Этымалогія слова «музей». Уяўленні аб музеі як інстытуце сацыяльнай памяці. Перыядызацыя гісторыі музейнай справы. Значэнне музейнай справы для гісторыі культуры, навукі і адукацыі.

### *Тэма 2. Крыніцазнаўства гісторыі музейнай справы*

Характарыстыка, аб'ект, прадмет крыніцазнаўства гісторыі музейнай справы. Задачы крыніцазнаўства гісторыі музейнай справы. Характарыстыка крыніц па гісторыі музейнай справы.

Класіфікацыя крыніц па гісторыі музейнай справы. Класіфікацыя пісьмовых крыніц.

Сістэматызацыя пісьмовых крыніц: агляды, вопісы, манаграфіі, кіраўніцтвы і дапаможнікі, перыядычныя і неперыядычныя выданні, справаздачы і матэрыялы камісій, каталогі, бібліяграфічныя агляды, рэфератыўныя выданні па гісторыі музейнай справы.

### *Тэма 3. Гістарыяграфія гісторыі музейнай справы*

Характарыстыка, аб'ект, прадмет і задачы гістарыяграфіі гісторыі музейнай справы.

Першыя спробы разгляду этапаў развіцця музеяў у даследаваннях К. Найкеля і І. Канольда (1727), К. Бёцігера (1808). Агляд дзейнасці асобных музеяў у працах Л. фон Ледэбура (1831), Г. Ф. Клема (1837), Э. Банафе (1867), Э. Р. Курцыуса (1870) і інш. Першыя абагульняючыя даследаванні па ўсеагульнай гісторыі музейнай справы Д. Мэры (1904) і яго канцэпцыя аб залежнасці развіцця музеяў ад узроўню культуры грамадства. Работы па гісторыі музейнай справы ў асобных краінах свету. Ю. фон Шлосер (1908), В. Шэрэр (1913).

Гісторыя калекцыяніравання ў працах Ф. Г. Тэйлара (1948), Н. фон Хольста (1960), Ж. Базэна (1967), Х. Закс (1971). Даследаванні А. Уітлін (1949, 1970) аб агульных тэндэнцыях развіцця музейнай справы ў свеце. Спробы абагульнення гісторыі развіцця спецыялізаваных музеяў Ф. Клема (1973), Ж. Базэна (1979, 1983) і інш. Праблемы гісторыі музеяў і пытанні рэфармавання музейнай справы ў другой палове XX ст. у даследаваннях Э. П. Алекзандэра (1979, 1983), З. Жыгульскага Малодшага (1982), К. Шрайнера (1983–1986), Дж. Льюіса (1984), К. Хадсана (1987) і інш.

Асвятленне гісторыі развіцця асобных музеяў Расіі ў другой палове XVIII ст. Выданне нарысаў аб узнікненні і дзейнасці музеяў, падрыхтаваных ініцыятарамі іх стварэння (А. І. Кытманаў, М. І. Палікарпаў і інш.), гісторыі асобных музеяў (І. Я. Забелін і інш.) і груп музеяў (музеяў АН, земскіх музеяў і інш.). Даследаванне У. С. Іконнікава «Вопыт рускай гістарыяграфіі» ў фарміраванні гісторыі музейнай справы (1891–1908). Працы Ф. І. Шміта (1919, 1929), Г. Л. Маліцкага і інш.

Выданне «Нарысаў гісторыі музейнай справы ў СССР і Расіі» калектывам гісторыкаў пад кіраўніцтвам А. М. Разгона (1957–1971). Даследаванні гісторыі развіцця музейнай справы ў рэспубліках СССР. Працы Г. Р. Мезенцавай (1959), Н. С. Садыкавай (1975) і інш. Выданне дапаможнікаў па гісторыі музейнай справы ў Расіі Л. В. Чыжовай (1991), А. І. Фралова (1991), С. А. Каспарынскай (1992), В. П. Грыцкевіча (2002, 2003, 2007) і інш.

Распрацоўка пытанняў гісторыі музейнай справы ў Беларусі. Працы Б. Р. Брэжга (1926), Г. А. Каханоўскага (1984), Л. В. Аляксеева (1996), А. А. Гужалоўскага (2001, 2002, 2004, 2013) і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II. Гісторыя музейнай справы

### *Тэма 4. Дамузейнае збіральніцтва ў Старажытным свеце і Сярэдневякоўі*

Збіральніцтва рэчаў у Старажытным свеце. Класіфікацыя дамузейных збораў А. Уітлін. Зборы эканамічнага значэння. Зборы сацыяльнага прэстыжу. Магічныя і іншыя рытуальныя зборы. Зборы як сродак выяўлення групавой прыналежнасці. Зборы як сродак стымуляцыі цікавасці да навакольнага свету і даследавання. Зборы як сродак эмацыянальнага перажывання.

Перадмузейныя зборы каштоўнасцей у перыяд старажытных цывілізацый. Перадмузейнае збіральніцтва ў Старажытнай Грэцыі. Храмавыя зборы як правобраз музеяў мастацтва. Геліконскае і Дэльфійскае свяцілішча муз. Сховішчы карцін (пінакатэкі), скульптур (гліптатэкі), каштоўных камянёў (дактыліятэкі). Александрыйскі і Пергамскі мусеёны.

Перадмузейнае збіральніцтва ў Старажытным Рыме. З'яўленне першых прыватных калекцый (галерэі Гая Вераса, Л. К. Сулы, Цыцэрона, імператараў Юлія Цэзара, Аўгуста, Нерона і Адрыяна і інш.). Выданне вопісаў калекцый і каталогаў. Антычныя дамузейныя зборы і публіка.

Дамузейнае збіральніцтва ў раннім Сярэдневякоўі. Уплыў ідэалогіі Сярэдневякоўя на адносіны да калекцыяніравання і яго характар. Храмы і іх скарбніцы. Свецкае калекцыяніраванне. Заснаванне дзяржаўных скарбніц. Старажытнабеларускае збіральніцтва. Княжацкія, манастырскія і іншыя зборы. Захаванне рэчаў у культавых мэтах і ў якасці сведкаў мінулага. Скарбніца вялікіх князёў літоўскіх у Вільні.

Асаблівасці калекцыяніравання на Усходзе ў эпоху Сярэдневякоўя.

### *Тэма 5. Узнікненне музея як сацыякультурнага інстытута. Музейная справа ў эпоху Адраджэння*

Гісторыка-культурныя перадумовы станаўлення эпохі Адраджэння. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Еўропы: пераарыентацыя гандлёвых шляхоў, развіццё рамёстваў, гандлю, Вялікія геаграфічныя адкрыцці, змены светапогляду, гуманізацыя культуры, узмацненне цікавасці да мінулага і гістарычнага вопыту чалавецтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Зараджэнне асобных спецыялізаваных калекцый і музеяў мастацкага, прыродазнаўчага, навукова-тэхнічнага і гістарычнага профіляў.

Адраджэнне прыватнага збіральніцтва ў эпоху Адраджэння як элемент рэнесансных адносін да гістарычнага мінулага. Мастацкія калекцыі дынастыі Медычы (Фларэнцыя), Ганзага (Мантуя), П. дэ Мантэфельтра (Урбіна). Мецэнацкая і калекцыянерская дзейнасць рымскіх пап у Рыме. Распаўсюджванне збіральніцтва на поўнач ад Альп. Збіральніцкая дзейнасць Вітэльсбахаў (Мюнхен), Габсбургаў (Вена, Прага, замак Амбрас), Францыска I Валуа (Фантэбло), Т. Хаўэрда і інш. (Англія). Мастацкія зборы ў палацах Эскарыял і Алькасар.

Развіццё прыродазнаўчых і навукова-тэхнічных калекцый і музеяў. Ф. Кальчалары (Верона), М. Меркаці (Рым), Ф. Імперата (Неапаль) і інш. Стварэнне калекцый экзатычных мінералаў, раслін, жывёл. Анатамічныя музеі і тэатры.

Дзяржаўныя скарбніцы: Таўэр (Лондан), Вавельскі замак (Кракаў), Збройная палата (Масква) і інш.

З'яўленне першых даследаванняў у галіне музеязнаўства. Узнікненне першых музеяў і іх назвы. Фарміраванне музейнай тэрміналогіі. Змяненне сацыяльнага складу збіральнікаў і калекцыянераў. Прадстаўленне прадметаў у калекцыях. Даступнасць тагачасных калекцый для публікі.

Прыватныя калекцыі магнацкіх родаў у Беларусі. Закрытыя зборы Радзівілаў, Сапегаў і інш.

### *Тэма 6. Фарміраванне музея як сацыяльнага інстытута ў эпоху Асветы*

Палітыка «асветнага абсалютызму» і яго ўплыў на культурныя працэсы. Пашырэнне кругагляду чалавека з дасягненнем поспехаў у прыродазнаўстве, развіцці навукі і навукова-тэхнічнай рэвалюцыі XVIII ст. Абсалютызацыя ролі навукі. Новая класіфікацыя ведаў. З'яўленне навуковых таварыстваў, адкрыццё акадэмій навук, універсітэтаў і іх уплыў на развіццё культуры і музея як феномена. Роля энцыклапедыстаў у развіцці музейнай справы.

Папулярызацыя дасягненняў навукі і твораў мастацтва ў музеях як увасабленне асветніцкіх ідэй. Пашырэнне прыватнага калекцыяніравання. Змены сацыяльных функцый збіральніцтва. Шматпрофільнасць і ўніверсальнасць прыватных збо-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раў. Разнастайнасць тыпаў музеяў і музейных збораў у Еўропе: кунсткамеры, пінакатэкі, арсеналы (цэйхгаўзы) і інш.

Фарміраванне палацавых калекцый мастацтва: Луўр (Парыж), Цвінгер (Дрэздэн), Імператарская галерэя (Вена), Эрмітаж (Санкт-Пецярбург) і інш. Прыватныя калекцыі твораў мастацтва (А. Рышэлье, Дж. Мазарыні, Карл І і інш.). Узнікненне мастацкіх выставак. «Салоны» Д. Дзідро.

Адкрыццё першых публічных прыродазнаўчых музеяў у Еўропе: Кунсткамера (Санкт-Пецярбург, 1714), Брытанскі музей (Лондан, 1753). Асаблівасці збораў натуральнага характару і іх уплыў на развіццё прыродазнаўчых навук. Прыватныя зборы натуральнага характару (бацькі і сына Традэскантаў, У. Ворма, А. Себа, Э. Левера і інш.).

Навукова-тэхнічныя музеі і калекцыі (А. Кірхера, Ж. Вакансона, Т. ван дэр Хульста і інш.). Асаблівасці зместу іх калекцый. Роля навуковых таварыстваў і ўніверсітэтаў у стварэнні падобных музеяў.

Музеі гістарычнага профілю. Новыя формы прадстаўлення гістарычных ведаў музейнымі сродкамі (панарамы, паноптыкумы).

Развіццё музейнай справы ва Усходняй Еўропе. Музейная справа ў Беларусі ў эпоху Асветы. Прыватныя мастацкія калекцыі ў Беларусі. З'яўленне музеяў пры навучальных установах (Полацкім езуіцкім калегіуме, Гродзенскай медыцынскай школе). Элементы вайсковых калекцый у магнацкіх зборах (Нясвіж, Дзярэчын). Новыя тэндэнцыі ў прыватным збіральніцтве. Мастацкія галерэі І. Храптовіча, І. Масальскага і інш. Прыватныя зборы натуральнага характару. Роля збіральнікаў Беларусі ў развіцці мастацтва, прыродазнаўства, дакладных навук.

### *Тэма 7. Пераўтварэнне музеяў у публічныя ўстановы. Музейная справа ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.*

Агульныя тэндэнцыі развіцця грамадства. Рамантызм як культурны напрамак, яго ўплыў на фарміраванне новага светапогляду. Працэс дэмакратызацыі музейных устаноў пад уплывам ідэй буржуазных рэвалюцый. З'яўленне шэрагу нацыянальных музеяў у краінах Заходняй Еўропы і Амерыкі. Стварэнне музеяў у краінах Усходняй Еўропы як вынік росту нацыянальнай свядомасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мастацкія музеі і іх развіццё. Стварэнне мастацкіх музеяў у Еўропе, Расійскай імперыі, на Амерыканскім кантыненце, у Афрыцы. Імклівы росквіт мастацтвазнаўства. Адкрыццё новых мастацкіх музеяў.

Спецыялізацыя музеяў прыродазнаўча-навуковага профілю.

Развіццё навукова-тэхнічных музеяў. Роля Ж. Вакансона ў папулярызацыі ведаў у галіне навукі і тэхнікі. Нацыянальная кансерваторыя мастацтваў і рамёстваў (Парыж, 1794). Навукова-тэхнічныя музеі Вялікабрытаніі. Прамысловыя і сельскагаспадарчыя выстаўкі ў Еўропе і Расійскай імперыі і іх уплыў на фарміраванне музейных калекцый.

Развіццё гістарычных музеяў. Стварэнне ваенна-гістарычных музеяў і музеяў нацыянальнай славы.

Новыя формы папулярызацыі ведаў пра грамадства і прыроду: панарамы, Амерыканскі музей Ф. Барнума, паноптыкум М. Цюсо. «Акадэмічны рад» (Gallerea progressiva). Адыход ад выключнай зацікаўленасці ў культурнай спадчыне Антычнасці. З'яўленне зацікаўленасці да мясцовых старажытнасцей. К. Томсэн і Музей паўночных старажытнасцей у Капенгагене (1819). Узнікненне руху за ахову і рэстаўрацыю нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны.

Рэарганізацыя Эрмітажа і Збройнай палаты. Распрацоўка праектаў стварэння нацыянальнага музея ў Расійскай імперыі (праекты Ф. Адэлунга, Б. Віхмана, Т. Зана, З. Валконскай, П. П. Свіньіна і інш.). Дзейнасць мецэнатаў і навуковых таварыстваў. Навуковыя экспедыцыі і стварэнне этнаграфічных музеяў і калекцый. І. Ф. Крузенштэрн, Ф. П. Літке, М. М. Пржавальскі, М. М. Міклуха-Маклай і іх роля ў стварэнні музейных калекцый. Навуковыя экспедыцыі ў Егіпце, на Блізкі Усход, у Грэцыю.

Пашырэнне прыватнага збіральніцтва ў Беларусі. Узнікненне крыніцазнаўчага падыходу ў збіральніцтве. Я. П. і К. П. Тышкевічы, А. Плятэр, А. Гюнтэр, Т. Нарбут, М. П. Румянцаў і інш. Прыватныя і вучэбныя прыродазнаўчыя калекцыі і кабінеты. Стварэнне прыватных мастацкіх калекцый і калекцый нацыянальнага мастацтва. Калекцыі К. Тызенгаўза, М. Тышкевіча, В. Пуслоўскага, І. Сабальшчыкова і інш. Прыродазнаўчыя прыватныя калекцыі. Стварэнне і дзейнасць сельскагаспадарчых выставак і музеяў. Вучэбныя музеі пры сярэдніх і вышэйшых навучальных установах (Віленскім універсітэце, Горы-Горацкім земляробчым інстытуце, гімназіях).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 8. Спецыялізацыя музеяў. Музейная справа ў другой палове XIX – пачатку XX ст.*

Уплыў адкрыццяў, развіцця гандлю і камерцыі, транспарту на стан музейнай справы. Развіццё спецыялізаваных музеяў: мастацкіх (у іх ліку прыкладнога і сучаснага мастацтва), прыродазнаўча-навуковых, навукова-тэхнічных, гістарычных (у тым ліку ваенна-гістарычных, этнаграфічных, царкоўна-гістарычных). Тэхнічная рэвалюцыя. Прамысловыя выстаўкі і іх уплыў на адкрыццё адпаведных музеяў. Паўднёва-Кенсінгтонскі музей у Лондане (1852), Аўстрыйскі мастацка-прамысловы музей у Вене (1864), Нямецкі музей рамёстваў у Мюнхене (1903) і інш.

Роля мецэнацтва, прыватнага калекцыяніравання, антыквараў і гандляроў мастацкімі каштоўнасцямі ў развіцці мастацкіх музеяў. Імклівае папаўненне збораў «старых» еўрапейскіх музеяў і ператварэнне іх ва ўстановы энцыклапедычнага характару (Луўр, Брытанскі музей, Эрмітаж). Буйнейшыя новыя мастацкія музеі (Метраполітэн-музей у Нью-Ёрку, Востраў музеяў у Берліне, Палац прыроды і Палац мастацтваў у Вене, Тэйт-галерэя ў Лондане, Смітсанаўскі музей у Вашынгтоне і інш.).

Фарміраванне спецыялізаваных гістарычных дысцыплін і ўзнікненне новых спецыялізаваных музеяў гістарычнага профілю. Навуковыя гістарычныя таварыствы і іх уплыў на дзейнасць музеяў.

Краязнаўчы і радзімазнаўчы рух у Еўропе. Рост цікавасці да мясцовай гісторыі. Масавае ўзнікненне музеяў мясцовага краю. Стварэнне гістарычных музеяў у шматнацыянальных дзяржавах.

Павышэнне цікавасці да народнай культуры і захавання помнікаў. Рух за стварэнне этнаграфічных музеяў. Сусветныя і першыя этнаграфічныя выстаўкі і іх роля ў стварэнні этнаграфічных музеяў. Стварэнне музеяў пад адкрытым небам.

Росквіт музейнай справы ў Расійскай імперыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Таварыства перасоўных выставак. Роля дзяржаўных органаў, прыватнай ініцыятывы (мецэнатаў і калекцыянераў) у пашырэнні музейнай сеткі імперыі. Дзяржаўны гістарычны музей, галерэя братоў С. М. і П. М. Трацьяковых, Музей прыгожых мастацтваў І. У. Цвятаева, Політэхнічны музей у Маскве, Рускі музей імя Аляксандра III і інш. Узнікненне першых літаратурна-мемарыяльных музеяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фарміраванне сучаснай структуры музеяў: вылучэнне фондаў і экспазіцыі. Інавацыі ў экспазіцыйным рашэнні музеяў (скансэны, мемарыялы, батальныя панарамы). Станаўленне і спецыялізацыя музейнай прафесіі (захавальнікі, рэстаўратары, папулярызатары калекцый). Фарміраванне музейнай грамадскасці. Пачатак музеязнаўчай адукацыі. Музеязнаўчыя выданні.

Уздым музейнага руху ў Беларусі. Асноўныя фактары павелічэння колькасці музеяў у Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Дэмакратызацыя грамадскага жыцця, уздым нацыянальнага руху, дзейнасць навуковых і царкоўна-археалагічных таварыстваў, архіўных і археалагічных камісій і іншых устаноў па стварэнні музеяў. Роля беларускай інтэлігенцыі ў стварэнніі Віленскага музея старажытнасцей.

Царкоўна-археалагічныя музеі і іх роля ў захаванні і вывучэнні гісторыка-культурнай спадчыны. Павелічэнне колькасці вучэбных музеяў пры сярэдніх навучальных установах Беларусі. Музеі навучальных дапаможнікаў. Стварэнне на тэрыторыі Беларусі музеяў і выставак эканоміка-тэхнічнага профілю. Прамысловыя выстаўкі, музеі пры палатах дзяржаўных маёмасцей, статыстычных камітэтах, земствах.

Росквіт прыватнага збіральніцтва ў Беларусі. Мастацкія зборы. Спецыялізацыя сярод збіральнікаў калекцый гістарычнага профілю. Стварэнне выключна археалагічных, нумізматычных, ваенна-гістарычных, археаграфічных і іншых калекцый. Дзейнасць збіральнікаў-натуралістаў.

*Тэма 9. Асноўныя тэндэнцыі развіцця музейнай справы ў краінах Заходняй Еўропы і Амерыкі паміж дзвюма сусветнымі войнамі*

Асаблівасці развіцця музейнай справы ў ліберальна-дэмакратычных краінах Заходняй Еўропы і ў ЗША. Павелічэнне колькасці музеяў розных профіляў. Наладжванне міжнароднага супрацоўніцтва ў межах Лігі нацый. Дзейнасць Міжнароднага бюро музеяў (1926–1946). Пашырэнне прафесійнай музеязнаўчай літаратуры і перыядычных выданняў.

Развіццё мастацкіх музеяў. Рост колькасці музеяў сучаснага і прыкладнога мастацтва. Нацыянальны музей сучаснага мастацтва ў Парыжы (1937).

Амерыканская мадэль развіцця музейнай справы з перавагай адукацыйных мэт. Буйнейшыя музейныя праекты, рэалізава-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя ў ЗША: Музей сучаснага мастацтва ў Нью-Ёрку (1929), Музей Г. Форда ў Грынфілд Вілідж (1929), «Каланіяльны Ульямсбург» (1934), Музей С. Гугенхейма ў Нью-Ёрку (1939), Нацыянальная галерэя ў Вашынгтоне (1941). Першыя вопыты сацыялагічнага вывучэння музейнай аўдыторыі.

Гістарычныя музеі (у тым ліку этнаграфічныя музеі). З'яўленне шэрагу музеяў пад адкрытым небам на амерыканскім кантыненце. Музей чалавека ў Францыі як процівага фашысцкай ідэалогіі, яго роля ў распаўсюджанні ідэй гуманізму, агульначалавечых каштоўнасцей.

Навукова-тэхнічныя і прыродазнаўчыя музеі.

Асаблівасці развіцця музеяў у таталітарных і аўтарытарных краінах Еўропы. Ідэалагізацыя і палітызацыя музейнай справы. Залежнасць музейнай справы ад ідэалагічных установак. Музей Рымскай імперыі (1926), Музей Б. Мусаліні ў Рыме (1938). Дзейнасць музеяў мясцовага краю нацысцкай Германіі па выхаванні «сапраўдных немцаў». Перабудова дзейнасці нямецкіх ваенна-гістарычных музеяў. Рэпрэсіі супраць музейных супрацоўнікаў, чысткі ідэалагічна шкодных музейных калекцый.

### *Тэма 10. Музейная справа ў СССР у 1917–1941 гг.*

Уплыў рэвалюцыйных падзей 1917 г. на музеі і музейную справу. Станаўленне савецкай сістэмы музеяў. Першыя заканадаўчыя акты савецкай улады ў галіне музейнай справы. Нацыяналізацыя, улік, рэгістрацыя культурных і навуковых каштоўнасцей. Стварэнне дзяржаўных органаў па кіраванні музеямі ў цэнтры і на месцах. Дзейнасць Усерасійскай калегіі па справах музеяў і ахове помнікаў мастацтва і даўніны.

Фарміраванне нацыянальнага музейнага фонду. Стварэнне сеткі музеяў новага тыпу. Пралетарскія музеі, музеі-ансамблі, гісторыка-рэвалюцыйныя і антырэлігійныя музеі. Музеі дзяржаўнага і мясцовага значэння. Музей і развіццё краязнаўчага руху.

Пошук новых форм навукова-асветніцкай работы. Прынцыпы музейнай работы ва ўмовах таталітарнага грамадства. Музей – цэнтр для арганізацыі калектыўнага мыслення мас.

Новая сетка савецкіх музеяў. Першы Усерасійскі музейны з'езд (Масква, 1930) і яго вынікі. Развіццё музеязнаўчай думкі. Выданне музеязнаўчых часопісаў. Стварэнне навукова-велед-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чых цэнтраў, распрацоўка праблем краязнаўчай і музейнай работы.

Арганізацыя падрыхтоўкі музейных кадраў. Дзейнасць вышэйшых музейных курсаў. Музейная аспірантура. Рэпрэсіі ў адносінах музейных супрацоўнікаў і краязнаўцаў. Страты ў музейнай справе. Продаж каштоўных музейных прадметаў, фізічнае знішчэнне помнікаў гісторыі і культуры.

**Музейная справа ў Беларусі.** Стварэнне першых савецкіх музеяў. Пошукі новых арганізацыйных форм для вырашэння пытанняў аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Прыцягненне кадраў мастацкай і навуковай інтэлігенцыі да музейнага будаўніцтва.

Роля музеяў у вывучэнні гістарычнага мінулага і прыроды Беларусі. Выданне заканадаўчых актаў, якія рэгулявалі стварэнне і дзейнасць музеяў. Распрацоўка праграмы развіцця музейнай справы.

Стабілізацыя музейнай сеткі ў 1923–29-х гг. Беларускі дзяржаўны музей і яго філіялы. Стварэнне музеяў у сістэме Інбелкульта і іншых ведамстваў. Узнікненне музеяў, прысвечаных палітычнай гісторыі. Пастанова СНК БССР аб музейным будаўніцтве (1928).

Роля мясцовай інтэлігенцыі ў стварэнні сеткі краязнаўчых музеяў. Краязнаўчыя музеі ў Слуцку, Полацку, Барысаве і іншых акруговых і раённых цэнтрах Беларусі. Роля краязнаўчага часопіса «Наш край» у распрацоўцы музейнай праблематыкі. Пытанні музейнага будаўніцтва на краязнаўчых канферэнцыях і з’ездах.

Паступовая ўніфікацыя музейнай справы. Нарада музейных супрацоўнікаў Беларусі (1932). Звужэнне задач музейнай дзейнасці да задач палітасветы. Пераўтварэнне экспазіцый у ілюстрацыйны ідэалагічны матэрыял. Знішчэнне музеяў і вываз помнікаў гісторыі і мастацтва за межы Беларусі. Барацьба з «рэчавым фетышызмам».

Музейная справа ў Заходняй Беларусі. Музеі пры навуковых таварыствах, гарадскія музеі і музеі Польскага краязнаўчага таварыства. Стварэнне і развіццё Беларускага музея імя І. Луцкевіча ў Вільні. Мерапрыемствы па ахове помнікаў гісторыі і культуры ў Заходняй Беларусі. Дзейнасць І. І. Ядкоўскага. Асаблівасці дзейнасці музеяў Заходняй Беларусі пасля верасня 1939 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 11. Музейная справа ў краінах свету ў другой палове XX – пачатку XXI ст.*

Разбурэнне калекцый і музеяў падчас Другой сусветнай вайны. Лёс культурных каштоўнасцей, вывезеных нацыстамі. Міжнародныя прававыя нормы аб рэстытуцыі культурных каштоўнасцей.

Уплыў навукова-тэхнічнага прагрэсу і павелічэння колькасці вольнага часу на ўзрастанне значэння музеяў у агульнай культуры грамадства. Рост колькасці музеяў у свеце. Дзейнасць міжнародных арганізацый у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны і музейнай дзейнасці розных краін. Роля ЮНЕСКА ў ахове культурных каштоўнасцей і развіцці культурнага супрацоўніцтва. Міжнародны цэнтр па даследаванні пытанняў аховы і аднаўлення культурных каштоўнасцей (Рымскі цэнтр).

Стварэнне і дзейнасць Міжнароднага савета музеяў (ІКОМ), яго мэты і структура.

Асаблівасці развіцця музеяў у розных рэгіёнах свету. Фарміраванне музеяў у краінах трэцяга свету. Стварэнне музейных установаў у краінах Лацінскай і Паўднёвай Амерыкі, Афрыкі і Азіі. Буйнейшыя музейныя праекты: Нацыянальны антрапалагічны музей у Мехіка (1964), Нацыянальны музей паветраплавання і касманаўтыкі ў Вашынгтоне (1976), Алімпійскі музей у Лазане (1982), Горад навукі і тэхнікі ў Парыжы (1986), Музей навукі і тэхнікі на Тайвані (1986), Музей цывілізацыі ў Квебеку (1988).

Новыя формы работы музейных установаў. Пашырэнне аб'ектаў музеефікацыі: Актыўны музей фашызму і супраціву ў Берліне, карабль-музей «Ваза» ў Стакгольме, «вестыбюльныя» экспазіцыі ў карпаратыўных будынках. Адраджэнне цікавасці да этнічнай гісторыі. Рух экамузеяў і «новая музеялогія». Музеефікацыя нематэрыяльнай спадчыны і «немузейных» установаў. Тэндэнцыя да дэцэнтралізацыі і канцэптуалізацыі музеяў.

Асаблівасці фарміравання і развіцця музеязнаўства як навуковай дысцыпліны. Стварэнне сеткі музейных даследчых і навучальных цэнтраў у свеце. Фарміраванне сістэмы падрыхтоўкі музейных спецыялістаў. Развіццё музейнай перыёдыкі. Часопіс «Museum». Узнікненне музейнай педагогікі, музейнай сацыялогіі як самастойных галін музейнай дзейнасці. Рацыяналізацыя музейнай дзейнасці, развіццё музейнага менедж-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

менту і маркетынгу. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у розных сферах музейнай дзейнасці. Музей і глабальная віртуальная прастора.

Агульная характарыстыка стану музейнай справы ў сацыялістычных краінах Усходняй Еўропы. Асаблівасці развіцця музеяў у гэтых краінах у канцы XX – пачатку XXI ст.

*Тэма 12. Музейная справа ў СССР і на постсавецкай прасторы ў другой палове XX – пачатку XXI ст.*

Дзейнасць музеяў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Вырашэнне задач захавання музейных каштоўнасцей. Эвакуацыя музейных каштоўнасцей летам 1941 г. Страты музейных каштоўнасцей.

Асаблівасці музейнай работы пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Аднаўленне і развіццё музейнай сеткі. Скарачэнне аднаўленчых работ у музеях у канцы 1940-х гг. Палітыка рэгламентацыі і стандартызацыі дзейнасці музеяў.

Узмацненне навукова-даследчай работы ў музеях. Стварэнне Навукова-даследчага інстытута музеязнаўства. Змяненне сістэмы кіравання музеямі.

Тэндэнцыі да дэмакратызацыі жыцця краіны з сярэдзіны 1950-х гг. і іх уплыў на развіццё музеяў. Узмацненне цікавасці да гісторыка-культурнай спадчыны. Стварэнне новай сістэмы кіравання музеямі. Вызначэнне асноўнага напрамку дзейнасці музеяў: камплектаванне і экспанаванне помнікаў савецкага перыяду гісторыі за кошт іншых этапаў гісторыі.

Пашырэнне музейнай сеткі. Стварэнне музеяў-запаведнікаў. Музеі ў гарадах-новабудоўлях. Рост сеткі мастацкіх, гістарычных і мемарыяльных музеяў. Грамадскія і народныя музеі 1970–80-х гг. Стварэнне цэнтралізаваных музейных сістэм, музейных аб’яднанняў. Размеркаванне музейных устаноў па тэрыторыі СССР. Пастановы ЦК КПСС па пытаннях развіцця музейнай справы і іх уплыў на развіццё музейнай справы (май 1964 г., жнівень 1982 г.).

Музейныя выстаўкі як найбольш эфектыўная і папулярная форма сацыяльна-культурнай камунікацыі. Навуковае праектаванне экспазіцый пачатку 1980-х гг. Развіццё «альтэрнатыўных» форм. Умовы захавання, уліку, вывучэння і прадстаўлення калекцый. Эканоміка музейнай справы. Фарміраванне сістэмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі музейных кадраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дэпалітызацыя грамадства і музейнай справы ў канцы 1980 – пачатку 1990-х гг. Музейны свет постсавецкіх рэспублік у канцы XX – пачатку XXI ст.

**Музейная справа ў Беларусі.** Вырашэнне задач захавання музейных каштоўнасцей падчас Вялікай Айчыннай вайны. Дзейнасць музейных устаноў на акупіраванай тэрыторыі. Страты музеяў БССР падчас вайны.

Узнаўленне і развіцё органаў кіраўніцтва музейнай справай. Аднаўленне музейнай сеткі БССР. Заканадаўчая база музейнай дзейнасці.

Стварэнне мемарыяльных музеяў, ваенна-гістарычных музеяў і музеяў вайсковай славы, абласных і раённых краязнаўчых музеяў. Уплыў пастаноў і палажэнняў урадавых устаноў рэспублікі канца 1940 – пачатку 1950-х гг. на развіццё музейнай справы. Рэарганізацыі сістэмы кіравання музеямі. Палітыка рэгламентацыі і стандартызацыі дзейнасці музеяў. Роля і месца ваенна-патрыятычнай тэматыкі ў камплектаванні музейных фондаў і іх выкарыстанне ў адукацыйна-выхаваўчых мэтах.

Змены ў жыцці краіны ў сярэдзіне 1950 – канцы 1960-х гг. і іх уздзеянне на развіццё музейнай справы. Павелічэнне колькасці музеяў. Стварэнне музеяў на грамадскіх пачатках і першых археалагічна-архітэктурных запаведнікаў. Будаўніцтва новых экспазіцый у музеях на аснове арыгінальных помнікаў. Раскрыццё ў экспазіцыях розных аспектаў нацыянальнай гісторыі. Рэабілітацыя ўдзельнікаў гістарычных падзей. Павелічэнне дзяржаўнага музейнага фонду ў колькасных адносінах. Стварэнне сістэмы ўліку і захавання фондавых калекцый.

Ідэалагізацыя ўсіх кірункаў музейнай дзейнасці. Слабае матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне і абмежаванае фінансаванне музеяў.

Стан музейнай справы ў канцы 1960-х – 1980-я гг. Узрастанне колькасці музеяў рознай падпарадкаванасці. З’яўленне новых тыпаў музея. Адкрыццё філіялаў галаўных музеяў у помніка архітэктуры. Прафесіяналізацыя музейнай дзейнасці.

Узмацненне партыйнага кіраўніцтва ў сферы культуры. Пастановы ЦК КПСС па пытаннях музейнага будаўніцтва і іх рэалізацыя ў Беларусі. Стварэнне аддзела культуры ЦК КПБ. Новая хваля рэпрэсій у Беларусі. Уплыў культу асобы. Пагаршэнне фінансавання музеяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Актывізацыя пытанняў рэстытуцыі беларускіх гісторыка-культурных каштоўнасцей і вяртання ў культавыя ўстановы рэчаў царкоўнага ўжытку ў канцы 1980-х гг.

Развіццё музейнай справы ў Беларусі ў канцы 1980-х – 1990-я гг. Дэідэалагізацыя музеяў. Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па вяртанні гісторыка-культурных каштоўнасцей. Пераацэнка галоўных сацыяльных функцый музеяў. Мадэрнізацыя музейных выставак.

Кадравы патэнцыял музеяў. Стварэнне лабараторыі музейнага праектавання ў Беларускім дзяржаўным інстытуце праблем культуры. Падрыхтоўка спецыялістаў у галіне музейнай справы ў вышэйшых навучальных установах. Адкрыццё аспірантуры па музеязнаўстве. Адкрыццё перападрыхтоўкі спецыялістаў па спецыяльнасці «музеязнаўства».

Утварэнне Беларускай асацыяцыі музеяў. Стварэнне Беларускага камітэта ІКОМ і яго рэгістрацыя.

Павелічэнне музейнай сеткі ў Беларусі ў 1990-я гг. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» і яго рэдакцыі. Перспектывы развіцця музейнай справы ў Беларусі. Нацыянальны музейны форум.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


*1. Ананьев, В. Г.* История зарубежной музеологии : учеб.-метод. пособие / В. Г. Ананьев. – СПб. : Ин-т истории С.-Петерб. гос. ун-та, 2014. – 316 с.

*2.* Беларускія музеі. Гісторыя. Хроніка. Сучаснасць / уклад. А. М. Калбаска; Беларус. ін-т праблем культуры. – Мінск : БелІПК, 1998. – 130 с. – (Музейныя сшыткі: навук.-метад. зб.; вып. 4).

*3. Бярэйшык, Л. У.* Музеі замежных краін: вучэб. дапам. для студэнтаў гіст. фак. спец. 1-23 01 12 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». У 2 ч. Ч. 1 : Музеі Еўропы / Л. У. Бярэйшык, А. А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2004. – 188 с.

*4. Бярэйшык, Л. У.* Музеі замежных краін : вучэб. дапам. для студэнтаў гіст. фак. спец. 1-23 01 12 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». У 2 ч. Ч. 2 : Музеі Азіі, Амерыкі, Аўстраліі, Афрыкі / Л. У. Бярэйшык, А. А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2008. – 247 с.

*5. Грицкевич, В. П.* История музейного дела до конца XVIII в. / В. П. Грицкевич. – СПб. : СПбУКИ, 2004. – 408 с.

*6. Грицкевич, В. П.* История музейного дела конца XVIII – начала XX в. / В. П. Грицкевич. – СПб. : СПбГУКИ, 2007. – 335 с.

*7. Грицкевич, В. П.* История музеев мира: учеб. пособие для студентов ист. фак. / В. П. Грицкевич, А. А. Гужаловский. – Минск : БГУ, 2003. – 284 с.

*8. Гужалоўскі, А. А.* Гісторыя музейнай справы Беларусі : вучэб.-метад. дапам. для студэнтаў выш. навучальных установ, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-23 01 12 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)» / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2012. – 302, [1] с.

*9. Гужалоўскі, А. А.* Музеі Беларусі (1918–1941) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2002. – 176 с.

*10. Гужалоўскі, А. А.* Музеі Беларусі (1941–1991) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2004. – 218 с.

*11. Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2001. – 124 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12.* Закон Республики Беларусь «О музеях и Музейном фонде», 3 июля 2011 г. // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2011. – № 78, 2/1833.

*13.* Музейное дело в России / под ред. М. Е. Каулен (отв. ред.), И. М. Коссовой, А. А. Сундиевой. – 2-е изд. – М. : Изд-во «ВК», 2005. – С. 35–208.

*14.* Основы музееведения: учеб. пособие / отв. ред. Э. А. Шулепова. – М. : Едиториал УРСС, 2005. – С. 108–214.

*15. Сотникова, С. И.* Музеология : пособие для вузов / С. И. Сотникова. – М. : Дрофа, 2004. – 192 с.

*16. Юренева, Т. Ю.* Музееведение: учебник для высш. школы / Т. Ю. Юренева. – М. : Акад. проект, 2003. – С. 15–316.

*Дадатковая*

*1. Алексеев, Л. В.* Археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е гг. XX в. / Л. В. Алексеев; под ред. Б. А. Рыбакова. – Минск : Беларус. навука, 1996. – 206 с.

*2.* Вопросы истории музейного дела в СССР: сб. науч. тр. / НИИ музееведения. – М., 1962. – Вып. 7. – 285 с. – (Очерки истории музейного дела в СССР; вып. 4).

*3. Жуков, Ю. Н.* Становление и деятельность советских органов охраны памятников истории и культуры, 1917–1920 гг. / отв. ред. Н. М. Катунова; АН СССР, Ин-т истории СССР. – М. : Наука, 1989. – 301 с.

*4. Каханоўскі, Г. А.* Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г. А. Каханоўскі; навук. рэд. Л. Д. Побаль. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.

*5. Каханоўскі, Г. А.* Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч / Г. А. Каханоўскі – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 62 с.

*6. Клепиков, Н. Е.* Культурно-историческое наследие Беларуси периода Российской империи / Н. Е. Клепиков. – Минск : Изд. центр Белорус. гос. ун-та, 2008. – 174 с.

*7. Клепиков, Н. Е.* Культурно-историческое наследие Беларуси, 1917–1932 гг. / Н. Е. Клепиков. – Минск : Изд. центр Белорус. гос. ун-та, 2008. – 150 с.

*8. Клепиков, Н. Е.* Памятники истории и культуры Беларуси (конец XVIII – первая треть XX в.) : проблемы сохранения / Н. Е. Клепиков. – Минск : Изд. центр БГУ, 2015. – 471 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*9.* Музееведческая мысль в России XVIII–XX веков : сб. док. и материалов / М-во культуры Рос. Федерации, Рос. ин-т культурологии ; авт.-сост. : Э. А. Шулепова [и др.]; отв. ред. Э. А. Шулепова. – М. : Этерна, 2010. – 957, [1] с.

*10.* Музеі Беларусі=Музеи Беларуси / рэд. савет: Г. П. Пашкоў, Л. В. Календа, М. Г. Нікіцін. – Мінск : БелЭн, 2008. – 559 с.

*11.* Музей и власть : сб. : в 2 ч. Ч. 1. Государственная политика в области музейного дела (XVIII–XX вв.) / НИИ культуры ; отв. ред. С. А. Каспаринская. – М. : НИИК, 1991. – 323 с.

*12.* Музейные учреждения и организации зарубежных стран: (кат.) / АН СССР, НИИ культуры ; сост.: З. С. Бутаева [и др.]. – М. : Б.и., 1987. – 118 с.

*13.* Очерки истории музейного дела в России : сб. ст. ; редкол.: П. И. Галкина, Г. А. Новицкий (отв. ред.) [и др.]. – М. : Сов. Россия, 1960. – 380 с. – (НИИ музееведения. Труды. Вып. 2).

*14.* Очерки истории музейного дела в России : сб. ст. / НИИ культуры ; отв. ред. Э. С. Коган. – М. : Сов. Россия, 1961. – 365 с. – (М-во культуры РСФСР, НИИ музееведения. Труды. Вып. 3).

*15.* Очерки истории музейного дела в СССР : сб. ст. – М., 1963. – Вып. 5. – 406 с. – (Сб. науч. тр. / НИИ музееведения; вып. 9).

*16.* Очерки истории музейного дела в СССР : сб. ст. / НИИ музееведения ; редкол.: А. Б. Закс (отв. ред.) [и др.]. – М. : Сов. Россия, 1968. – 434 с.

*17.* Очерки истории музейного дела в СССР : сб. ст. / НИИ музееведения ; отв. ред. А. Б. Закс. – М. : Сов. Россия, 1971. – Вып. 7. – 416 с.

*18. Полунина, Н. М.* Основатели. Российские просветители / Н. М. Полунина, А. И. Фролов. – М. : Сов. Россия, 1990. – 136 с.

*19. Федоров, Н. Ф.* Музей, его смысл и назначение / Н. В. Федоров // Н. Ф. Федоров. Сочинения / общ. ред. А. В. Гулыга ; вступ. ст., примеч. и сост. С. Г. Семеновой. – М. : Мысль, 1982. – С. 575–606.

*20.* Формирование государственной музейной сети (1917 – первая половина 60-х годов) / АН СССР ; Д. А. Равикович. – М. : [Б. и.], 1988. – 151 с.

*21. Хадсон, К.* Влиятельные музеи / К. Хадсон ; пер. с англ. Л. Мотылева. – Новосибирск : Науч.-изд. центр «Сиб. хронограф», 2001. – 196 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*22. Шмелев, В. Г.* Музеи под открытым небом: очерки возникновения и развития / В. Г. Шмелев. – Киев : Наукова думка, 1983. – 119 с.

*23. Шмит, Ф. И.* Исторические, этнографические, художественные музеи. Очерки истории и теории музейного дела / Ф. И. Шмит. – Харьков : Свет, 1919. – С. 1–28.

*24. Шмит, Ф. И.* Музейное дело. Вопросы экспозиции / Ф. И. Шмит. – Л. : ACADEMIA, 1929. – 245 с.

*25. Юренева, Т. Ю.* Музей в мировой культуре / Т. Ю. Юренева. – М. : Рус. слово, 2003. – 532 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Арганізацыя вучэбнай работы студэнтаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў па гісторыі музейнай справы.

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– гісторыка-тэматычны падыход;

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дыялогі, абмен думкамі і інш.).

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавую, крэдытна-модульную сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Замацаванне атрыманых ведаў мае працяг пры праходжанні вучэбнай і вытворчай практыкі ў музеях краіны, напісанні курсавой і дыпломнай работы па дадзенай дысцыпліне.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работы студэнтаў арганізуецца ў адпаведнасці з вучэбным планам (рабочыя варыянты). Прадугледжваюцца такія формы, як падрыхтоўка студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, падрыхтоўка прэзентацый, складанне бібліяграфічных спісаў і інш.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з’яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас семінарскіх і лекцыйных заняткаў, а таксама ў час правядзення экзамену.

Выкладчык-прадметнік знаёміць студэнтаў са спецыфікай той ці іншай самастойнай работы і спосабамі яе кантролю на ўводнай лекцыі па вучэбнай дысцыпліне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

| Балы | Крытэрыі ацэнкі на экзамене |
|---|---|
| 1 (адзін)<br>не залічана | Адзнака ставіцца студэнту, калі спроба адказу цалкам не адпавядае зместу прапанаваных яму пытанняў |
| 2 (два)<br>не залічана | Адзнака ставіцца студэнту, які мае істотныя прабелы ў галіне гісторыі музейнай справы, не набыў уменняў арыентавацца ў праграмным матэрыяле, не засвоіў большую частку вучэбнага матэрыялу; не арыентуецца ў падзеях музейнага жыцця свету і Беларусі; прапусціў і не адпрацаваў семінарскія заняткі і не выканаў заданні па самастойнай рабоце, адсутнічаюць уяўленні пра існаванне музеязнаўчай тэрміналогіі |
| 3 (тры)<br>не залічана | Адзнака ставіцца студэнту, які валодае праграмным матэрыялам у аб'ёме, дастатковым для далейшага навучання, здольны вызначыць асноўныя этапы развіцця музейнай справы, аднак вельмі слаба арыентуецца ў падзеях музейнага жыцця краін свету і Беларусі, мае агульныя ўяўленні аб іх і не ў стане растлумачыць іх сутнасць, не валодае музеязнаўчай тэрміналогіяй, не вызначаўся актыўнасцю і зацікаўленасцю прадметам на семінарскіх занятках, а таксама пры выкананні самастойнай работы, не поўнасцю адпрацаваў практычныя заняткі, па выніках рубежнага кантролю мае адмоўныя адзнакі |
| 4 (чатыры)<br>залічана | Адзнака ставіцца студэнту, які неглыбока валодае асноўным вучэбным матэрыялам па праграме, неабходным для далейшай вучобы і для работы па спецыяльнасці, слаба арыентуецца ў гісторыі музейнай справы розных краін свету, слаба засвоіў асноўную літаратуру па праграме і не знаёмы з музейным заканадаўствам; не праявіў актыўнасць на семінарскіх занятках, але атрымаў станоўчую адзнаку за выкананне бальшасці заданняў практычнага характару; дапускае памылкі ў адказах на экзамене і слаба арыентуецца ў музейна-спецыфічных тэрмінах |
| 5 (пяць)<br>залічана | Заслугоўвае студэнт, які ў асноўным засвоіў вучэбны матэрыял па праграме, арыентуецца ў гісторыі музейнай справы розных краін свету і Беларусі, засвоіў большасць матэрыялу па асноўнай музейнай літаратуры, прымаў удзел у семінарскіх занятках і выканаў усе заданні, атрымаўшы станоўчыя адзнакі; асэнсавана пераказвае праграмны матэрыял, але ў адказе на экзаменацыйныя і дадатковыя пытанні дапусціў неістотныя памылкі, не карыстаецца неабходнай музейнай тэрміналогіяй |
| 6 (шэсць)<br>залічана | Заслугоўвае студэнт, які поўна ведае вучэбны матэрыял па праграме, асноўныя падзеі гісторыі музейнай справы ў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | розных краінах свету і Беларусі, засвоіў большую частку матэрыялу па асноўнай літаратуры, прымаў удзел у семінарскіх занятках і выканаў усе заданні, атрымаўшы станоўчыя адзнакі; асэнсавана пераказвае праграмны матэрыял, але ў адказе на экзаменацыйныя і дадатковыя пытанні дапускае неістотныя памылкі, не карыстаецца неабходнай музейнай тэрміналогіяй |
| 7 (сем) залічана | Заслугоўвае студэнт, які трывала і грунтоўна ведае вучэбны матэрыял па праграме; арыентуецца ў падзеях музейнага жыцця розных краін свету і Беларусі ў розныя перыяды развіцця, засвоіў большасць матэрыялаў з рэкамендаванай літаратуры па дысцыпліне; актыўна працаваў на семінарскіх занятках; своечасова выканаў усе заданні і атрымаў станоўчыя адзнакі, аднак у адказах на экзаменацыйныя і дадатковыя пытанні дапускае нязначныя памылкі, рэдка ўжывае музейна-спецыфічныя тэрміны пры адказах на пытанні |
| 8 (восем) залічана | Заслугоўвае студэнт, які паказаў добрае веданне вучэбнага матэрыялу па праграме і добра арыентуецца ў падзеях музейнага жыцця розных краін свету і Беларусі ў розныя перыяды развіцця; засвоіў матэрыял па асноўнай літаратуры, прапанавай у праграме; самастойна і своечасова выканаў усе заданні па самастойнай рабоце па курсе, праявіў актыўнасць на семінарскіх занятках; падчас адказу на экзаменацыйныя і дадатковыя пытанні не дапусціў памылак, матэрыял выкладае без значных парушэнняў, лагічна і паслядоўна, падчас экзамену паказаў добрае валоданне музейна-спецыфічнай тэрміналогіяй; па выніках рубежнага кантролю не мае нездавальняючых адзнак |
| 9 (дзевяць) залічана | Заслугоўвае студэнт, які поўна і сістэмна засвоіў вучэбны матэрыял па праграме дысцыпліны, добра ведае музейнае жыццё Беларусі і іншых краін свету ў розныя перыяды гісторыі іх развіцця, глыбока засвоіў асноўную і знаёмы з дадатковай літаратурай, а таксама з заканадаўчымі дакументамі і інструкцыямі, якія рэгламентуюць розныя бакі музейнай дзейнасці; актыўна працаваў на семінарскіх занятках, на высокім узроўні выканаў усе віды заданняў па прадмеце; адказ на экзамене характарызуецца дакладнасцю, матэрыял падае паслядоўна, лагічна, падчас адказу вольна карыстаецца адпаведнымі музейнымі тэрмінамі, па выніках рубежнага кантролю мае выдатныя і добрыя адзнакі |
| 10 (дзесяць) залічана | Заслугоўвае студэнт, які поўна, глыбока і сістэмна засвоіў вучэбны матэрыял па праграме дысцыпліны, выдатна ведае і арыентуецца ў падзеях музейнага жыцця Беларусі і |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | іншых краін свету ў розныя перыяды гісторыі іх развіцця, глыбока засвоіў асноўную і дадатковую літаратуру, а таксама заканадаўчыя дакументы і інструкцыі, якія рэгламентуюць розныя бакі музейнай дзейнасці; творча і актыўна працаваў на семінарскіх занятках, самастойна і на высокім узроўні выканаў усе віды заданняў па прадмеце; адказ на экзамене характарызуецца дакладнасцю, падчас адказу самастойна аналізуе матэрыял, падае яго на экзамене паслядоўна, лагічна і дакладна, вольна карыстаецца адпаведнымі музейнымі тэрмінамі, па выніках рубежнага кантролю мае выдатныя і добрыя адзнакі |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ГІСТОРЫЯ МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,69. Ул.-выд. арк. 1,22. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ